ШКОЛЬНАЯ ПРАГРАМА

**Л. Э. Сенкевіч   М. К. Грыцэнка**

# БЕЛАРУСКАЯ МОВА

## 4 клас

***Тэставыя работы з правіламі і заданнямі***

Дапаможнік для вучняў устаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання

Мінск
«Сэр-Віт»
2023

## Ад аўтараў

***Шаноўны сябар!***

Чацвёрты год навучання – гэта фундамент тваіх ведаў для далейшага паспяховага вывучэння беларускай мовы.

Дапаможнік, які мы падрыхтавалі для цябе, дазволіць пазнаёміцца з творамі беларускіх пісьменнікаў і паэтаў, пашырыць свой слоўнікавы запас, развіць вусную і пісьмовую мову.

Практыкаванні і заданні накіраваны на тое, каб дадаткова пазаймацца па пройдзенай тэме, адпрацаваць арфаграфічныя навыкі, самастойна ці пад кіраўніцтвам настаўніка выканаць заданні. Многія заданні суправаджаюцца сістэмай пытанняў, якія спрыяюць арганізацыі паўтарэння на працягу ўсяго курса вывучэння мовы.

Пасля кожнай тэмы ты зможаш праверыць свае веды па прапанаваных тэстах. Тэставыя работы адпавядаюць дзесяцібальнай шкале адзнак і дазваляюць паглыбіць веды, разнастаіць практычную работу.

***Жадаем поспехаў!***

3. Прачытай сказы. Знайдзі роднасныя словы, абазнач корань.

Летам я паехаў на р..балку ў вёску. Вёсачка была нев..лікая. Усяго хат дзесяць. За вёскаю было в..лікае возера. В..сковыя жыхары ахвотна паказалі мне дарогу да яго.

✶ Устаў прапушчаныя літары.
✶ Падкрэслі словы-формы аднаго і таго ж слова.

4. Прачытай сказы. Падкрэслі словы, якія выкарыстаны ў прамым значэнні.

Па сцяжынцы **ішла** дзяўчынка. Насценны гадзіннік **ішоў** без перабояў.

**Спяваў** за акном вецер. Весела **спяваў** у алешніку салавей.

5. Выберы і падкрэслі ў дужках патрэбнае слова ў кожны сказ.

Месяц павольна (вылятаў, выплываў, выходзіў) з-за хмар.

(Разгарнула, раскрыла, адчыніла) свае сінія вочкі пралеска.

Хутка крочыць па палях (чырвоная, залатая, алавяная) восень.

✶ Абвядзі словы, якія ўжываюцца ў пераносным значэнні.
✶ Якія словы маюць толькі адно значэнне? Запішы.

---

✶ Падкрэслі ў кожным сказе галоўныя члены.

***Папрактыкуйся.***

**1.** Прачытай тэкст. Устаў прапушчаныя літары.

**Бусліная сям'я**

Некалькі г..доў назад мой тата прымацава.. на даху хля..а́ старое кола. Яго адразу заўважылі буслы.

Я вельмі люблю гэтых паважных, грацыёзных птушак. Буслы м..не зусім не баяцца.

Сёлета бусліная сям'я пав..лічылася. Выв..лася ажно чатыры птушаняці! Буслы даглядаюць дзяцей без а..пачынку. Яны стараюцца не абдз..ліць ніводнага бусл..няці. (*Паводле І. Муравейкі.*)

✶ Да якога тыпу адносіцца тэкст?

______________________________________________

✶ Запішы словы, якія дапамагаюць звязваць сказы ў тэксце.

______________________________________________

✶ Выпішы з тэксту апавядальны клічны сказ.

______________________________________________

**2.** Вызначы тыпы тэкстаў па іх назвах. Запішы.

Восень у лесе. ______________________________

Восеньскія прыгоды. __________________________

Чаму ўвосень лісце жаўцее? ____________________

***Памятай!*** Аднародныя члены сказа звязваюцца паміж сабой інтанацыяй пералічэння і словамі *і*, *а*, *але*. Словы ***і***, ***а***, ***але*** – гэта **злучнікі**.

**2.** Прачытай сказы. Пастаў патрэбныя знакі прыпынку.

1. Гарады Орша і Шклоў стаяць на правым беразе Дняпра. 2. Зямля стрэхі агарод накрыліся белым покрывам. (*Паводле І. Грамовіча.*)

***Памятай!*** Паміж аднароднымі членамі сказа ставіцца коска, калі яны звязаны паміж сабой інтанацыяй і злучнікамі ***а***, ***але***: *Восенню сонца свеціць, але не грэе. Паўлік ужо не хмурыўся, а заходзіўся ад смеху.*

*У рэках Беларусі водзяцца акуні**,** плоткі**,** ляшчы.*

**3.** Прачытай прымаўкі. Пастаў патрэбныя знакі прыпынку.

1. Кастрычнік зямлю балоціць а лес залоціць. 2. Згінулі сцюжы марозы мяцеліцы. *(Я. Купала.)* 3. Паўлюк толькі зірнуў але нічога не сказаў. (*Я. Колас.*)

***Памятай!*** Калі два аднародныя члены сказа звязаны злучнікам ***і***, то коска паміж імі не ставіцца: *Пасля ўрокаў хлопчыкі і дзяўчынкі выбеглі на вуліцу.*

Калі аднародныя члены сказа звязаны злучнікам ***і***, які паўтараецца, то коска паміж імі ставіцца: *Я рад і сонцу, і вясне, і дожджыку. (Я. Пушча.)*

## *Давальны і месны склоны*

### *Папрактыкуйся.*

1. Пастаў назоўнікі ў табліцы ў форму давальнага і меснага склонаў.

| Скл. | Аснова | | | |
|---|---|---|---|---|
| | на цвёрды зычны | на мяккі зычны | на зацвярдзелы зычны | на ***г, к, х*** |
| | вясна<br>пчала | матуля<br>зязюля | сястра<br>памочніца | хустка<br>дачка |
| **Д.** | | | | |
| | | | | |
| **М.** | | | | |
| | | | | |

✶ Абазнач канчаткі назоўнікаў.

*Склонавыя канчаткі назоўнікаў 1-га скланення*

| Скл. | Аснова | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| | на цвёрды зычны | на мяккі зычны | на зацвяр-дзелы зычны | на ***г, х*** | на ***к*** |
| **Д.** | -***е***<br>размов**е** | -***і***<br>зямл**і** | -***ы***<br>сустрэч**ы** | -***е***<br>наз**е** | пад націскам канчатак -*э*: дачц**э́**, аб муц**э́**; не пад націскам -*ы*: х**у́**стцы, пры х**а́**тцы |
| **М.** | -***е***<br>аб размов**е** | -***і***<br>аб зямл**і** | -***ы***<br>аб сустрэч**ы** | -***е***<br>аб страс**е** | |

**3.** Пастаў словы ў дужках у форму патрэбнага склону. Запішы.

- Шэры коцік спіць у (кут) ____________________,

  А сабачка спіць у (буда) ____________________.

- Я хаджу па белым (свет) ____________________ –

  Ваш найлепшы сябар, дзеці,

  І вядома нават мне,

  Што вы бачыце ў (сон) ____________________.

✶ У якіх словах адбываецца карнявое чаргаванне зычных? Запішы.

______________________________________________________________

**4.** Пастаў назоўнікі ў форму меснага склону.

| | |
|---|---|
| Сынок – пры ______________ | лапаць – на ______________ |
| гусак – аб ______________ | двор – на ______________ |
| абед – на ______________ | сын – аб ______________ |
| слон – на ______________ | каласок – на ______________ |

✶ Абазнач канчаткі назоўнікаў.

**5.** Прачытай. Абазнач канчаткі. Падкрэслі апошнія літары асновы.

Стог – на стозе, гарох – у гаросе, корак – на корку, жук – аб жуку, лётчык – аб лётчыку, рак – аб раку, гарошак – на гарошку, матылёк – на матыльку, лясок – у ляску, лужок – на лужку.

✶ Абазнач канчаткі назоўнікаў з асновай на ***к*** у месным склоне.

цягнік спыніўся __ р., __ л.

дзяўчынка чытала __ р., __ л.

дзеці гулялі __ р., __ л.

птушка паляцела __ р., __ л.

хлопчык пісаў __ р., __ л.

**5.** Устаў дзеясловы прошлага часу. Вызначы іх лік і род.

За горадам __________ прыгожы парк. На ўроку настаўніца ____________ верш пра вавёрку. За вёскай ___________ густы лес. Паляўнічы __________ на снезе сляды зайца.

*Словы-падказкі*: чытала, раскінуўся, убачыў, рос.

**6.** Прачытай тэкст. Замяні дзеясловы цяперашняга часу дзеясловамі прошлага часу. Запішы атрыманы тэкст. Вызначы род і лік дзеясловаў.

### Надыход вясны

Вясна прыходзіць раптоўна. Сонца паднімаецца над лесам. Яно шырока расплюшчвае вочы. Снег чарнее і асядае. З узгоркаў бягуць ручайкі. На схілах паказваюцца чорныя плямы. Зямля ўздыхае пасля доўгага зімовага сну.

______________________________________________

______________________________________________

______________________________________________

# ЗМЕСТ

**Ад аўтараў** . . . . . 3
**Паўтарэнне вывучанага ў 3-м класе** . . . . . 4
**Тэкст** . . . . . 9
Сувязь сказаў у тэксце . . . . . 9
План . . . . . 11
Тэкст-апавяданне. Тэкст-апісанне. Тэкст-разважанне . . 14
**Сказ** . . . . . 20
Аднародныя члены сказа . . . . . 20
Знакі прыпынку пры аднародных членах сказа . . . . . 23
**Склад слова** . . . . . 28
Аснова слова . . . . . 28
**Назоўнік** . . . . . 32
Змяненне назоўнікаў па склонах. Тры скланенні назоўнікаў . . . . . 32
Назоўнікі 1-га скланення, іх канчаткі . . . . . 37
Назоўны, родны і вінавальны склоны . . . . . 37
Давальны і месны склоны . . . . . 42
Творны склон . . . . . 43
Назоўнікі 2-га скланення, іх канчаткі . . . . . 46
Назоўны і вінавальны склоны . . . . . 46
Родны склон . . . . . 51
Давальны і творны склоны . . . . . 54
Месны склон . . . . . 58
Назоўнікі 3-га скланення, іх канчаткі . . . . . 62
Назоўны і вінавальны склоны . . . . . 62
Родны, давальны і месны склоны . . . . . 66
Творны склон . . . . . 69
Скланенне назоўнікаў у множным ліку . . . . . 72
Назоўны склон . . . . . 72
Родны склон . . . . . 76

Давальны і творны склоны . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 79
Месны склон . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 82
**Прыметнік** . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 86
Змяненне прыметнікаў па родах, ліках і склонах . . . . . . 86
Скланенне прыметнікаў мужчынскага і ніякага роду . . . 90
Скланенне прыметнікаў жаночага роду . . . . . . . . . . . . 94
Скланенне прыметнікаў множнага ліку . . . . . . . . . . . . 99
**Займеннік** . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 104
Займеннік як часціна мовы . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 104
Скланенне займеннікаў . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 108
**Дзеяслоў** . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 114
Змяненне дзеясловаў па часах і ліках . . . . . . . . . . . . 114
Неазначальная форма дзеясловаў . . . . . . . . . . . . . . . 118
Змяненне дзеясловаў цяперашняга і будучага часу па асобах і ліках (спражэнне) . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 121
I і II спражэнне дзеясловаў. Канчаткі дзеясловаў 1-й асобы адзіночнага ліку . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 125
Канчаткі дзеясловаў 3-й асобы множнага ліку I і II спражэння . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 127
Канчаткі дзеясловаў 1-й асобы множнага ліку I і II спражэння . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 130
Канчаткі дзеясловаў 2-й асобы адзіночнага ліку I і II спражэння . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 131
Канчаткі дзеясловаў 2-й асобы множнага ліку I і II спражэння . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 134
Канчаткі дзеясловаў 3-й асобы адзіночнага ліку I і II спражэння . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 136
**Спіс выкарыстаных крыніц** . . . . . . . . . . . . . . . . . . 140